УДК 316.33

# РОЛЯ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ Ў СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВЕ

**В.Ф. Жылевіч**
Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, jilevitch@gmail.com

У сучасную эпоху глабалізацыі і выбуховага характару навукова–тэхнічнага прагрэсу, нязменных катаклізмаў навакольнага асяроддзя, на дзяржаву ўскладаецца адказнасць за фармулёўкі прыярытэтаў і мэт нацыянальнага развіцця, выбар шляхоў і інструментаў эфектыўнага дасягнення пастаўленых мэт. Аднак апроч гэтага дзяржава адказвае за вытворчасць грамадскага дабрабыту, адным з якіх зяўляецца адукацыя. Узрастае разуменне ролі і значнасці адукацыі для паспяховага развіцця краіны ў сучасных умовах.

Уплыў адукацыі на эканамічнае развіццё грамадства адзначаны навукоўцамі ўжо даўно. Яшчэ прафесар Маскоўскага ўніверсітэта І. Х. Озераў, адзначаючы, што праца ангельскага ці нямецкага рабочага больш прадукцыйная працы расійскага рабочага, звязваў гэта з развіццём агульнай адукацыі, якая служыць базай для тэхнічнай, і адзначаў велізарнае адставанне ва ўзроўні і пашырэнні агульнай адукацыі насельніцтва Расіі ад гэтых краін [1, с. 23].

Ужо напачатку другой паловы XX ст. прыходзіць масавае ўсведамленне вырашальнага значэння чалавечага фактару ў эканоміцы. Сфармавалася і атрымала развіццё канцэпцыя “чалавечага капіталу”, які мае вытокі ў класічнай палітэканоміі. Адам Сміт пісаў: “Набыццё такіх здольнасцяў, лічачы таксама ўтрыманне іх уладальніка цягам яго выхавання, навучання ці вучнёўства, заўсёды патрабуе сапраўдных выдаткаў, якія ўяўляюць сабою асноўны капітал, які быццам бы рэалізоўваецца ў яго асобе. Гэтыя здольнасці…, разам з тым – частка багацця ўсяго грамадства…“ [2, с. 208]. Адукацыя з’яўляецца адной са складнікаў “чалавечага капіталу”. Сёння відавочна, што не фізічны, а чалавечы капітал, не машыны, а людзі ўяўляюць сабой сілу эканамічнага росту. У паняцце нацыянальнага дабрабыту ўключаюць разам з рэчыўнымі элементамі капіталу, фінансавымі актывамі, і матэрыялізаваныя веды і здольнасці людзей да працы.

У сучасным беларускім грамадстве адукацыя – адна з найбольш шырокіх сфер чалавечай дзейнасці. Вышэйшая адукацыя – вядучы фактар сацыяльнага, палітычнага і эканамічнага прагрэсу. Прычына такой увагі да вышэйшай школы заключаецца ў разуменні таго, што асноўным капіталам сучаснага грамадства з’яўляецца чалавек, здольны да пошуку і засваення новых ведаў і прыняцця нестандартных рашэнняў.

Іспанская навукова–даследчая лабараторыя *Laboratorio de Internet* абнавіла сусветны вэба–метрычны рэйтынг універсітэтаў. Сярод беларускіх вышэйшых навучальных устаноў найбольш высокае месца займае Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — 584–е. Усяго ж у рэйтынгу *Webometrics* за 2016 год улічваліся дадзеныя больш 22 000 вышэйшых навучальных устаноў па ўсім свеце [3]. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт увайшоў таксама ў тройку лепшых універсітэтаў СНД за 2016 год, саступіўшы толькі Маскоўскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту ім. М. В. Ламаносава (134–е месца) і Санкт–Пецярбургскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту (452–е месца).

**Мэта** навуковага даследавання – выявіць ролю вышэйшай адукацыі ў развіцці беларускага грамадства.

У беларускім грамадстве маюць месца наступныя тэндэнцыі развіцця вышэйшай школы:
– павелічэнне працягласці атрымання агульнай адукацыі;
– неабходнасць бесперапыннай адукацыі (на працягу ўсяго жыцця);

ПолесГУ

– індывідуалізацыя вышэйшай адукацыі;

– рост значнасці метадалагічных ведаў і аналітычных навыкаў.

Неабходна адзначыць, што апошнія 20 гадоў вышэйшыя школы Беларусі ўмацоўваюць міжнародныя сувязі. З пачатку XXI ст. пашыраецца двухбаковае супрацоўніцтва ў рамках Савета Еўропы, ЮНЭСКА. Мноства ВНУ краіны прымаюць удзел у еўрапейскім супрацоўніцтве для развіцця і дэмакратызацыі студэнцкай мабільнасці.

Развіццё міжнародных сувязаў у сферы адукацыі паставіла пытанне пра патрэбу пашырэння выкарыстання ангельскай мовы ў навучальным працэсе для прыцягнення большай колькасці замежных студэнтаў у вышэйшых школах Беларусі. Разглядаецца магчымасць выкладання матэматыкі, гісторыі і т. п. на замежных мовах, якія з'яўляюцца не толькі прадметам вывучэнні, але і сродкам камунікацыі, міжкультурных абменаў. Разам з тым пытанне пра большае ўкараненне ў ВНУ ангельскай мовы, на якой ыкладаліся б розныя вучэбныя прадметы, застаецца дыскусійным.

У апошні час студэнцкая іміграцыя – адзін з прыярытэтаў селектыўнай іміграцыйнай палітыкі Беларусі. З 2000 г. па 2015 г. колькасць замежных студэнтаў у краіне ўзрасла да 14,6 % усіх беларускіх студэнтаў. Гэта вынік актыўнай працы Беларусі па прыцягненні студэнтаў, якая ўжыццяўляецца цэнтрамі навучання. Большасць замежных студэнтаў вывучае эканоміку, медыцыну, біялогію, гуманітарныя навукі, новыя тэхналогіі. Самі беларусы неахвотна ідуць вучыцца і працаваць у сферу навукі па тэхнічных спецыяльнасцях. У гэтыя вобласці краіна плануе скіроўваць замежных студэнтаў. У Беларусі атрымліваюць адукацыю ў большасці выхадцы з усходніх краін, афрыканцы, індусы і кітайцы. Запрашэнне замежных студэнтаў разглядаецца ўрадам Беларусі ў якасці стратэгіі, якая дазваляе краіне заняць належнае месца ў свеце і як важную перавагу айчыннай сістэмы вышэйшай адукацыі.

Такім чынам, дзяржаўная палітыка ў дачыненні да вышэйшай школы накіравана на яе дэмакратызацыю, адкрытасць у доступе да ведаў і падтрымку студэнтаў пры навучанні ў ВНУ, незалежна ад сацыякультурнага паходжання, узросту і фінансавага становішча. Плануецца ўзмацніць прафесійную арыентацыю на першых курсах вышэйшых школ, надаць асаблівую ўвагу засваенню лічбавых тэхналогій.

Дзяржаўныя стратэгіі накіраваны на развіццё сувязяў паміж універсітэтамі, школамі і навуковымі цэнтрамі, дасягненне большага міжнароднага прызнання беларускіх ВНУ, сістэмы ўніверсітэцкай адукацыі, навуковых даследаванняў. Замацоўваецца магчымасць выкладання на замежных мовах, мяркуецца правядзенне незалежных ад эканамічнай кан'юнктуры даследаванняў, спрашчэнне працэдуры ўкаранення навуковых дасягненняў у эканоміку і вытворчасць, а таксама ўзмацненне ролі дзяржавы ў кансалідацыі фундаментальных даследаванняў і забеспячэнні іх фінансавання.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Озеров, И. Х. Финансовая реформа в России. Откуда у нас государство берет деньги и на что их расходует / И. Х. Озеров. – М., 1906. – 307 с.

2. Смит, А. Исследование о природе и причинах богатства народов / А. Смит. – М.: Наука, 1962. – 409 с.

3. Laboratorio Nacional de Internet del Futuro (LaNIF) [Electronic resource] – Mode of access: https://www.infotec.mx/en_ar/infotec/Laboratorio_Nacional_de_Internet_del_Futuro_LaNIF – Date of access: 17.03.2017.

Полесгу